**СТЫЛЬ** – спецыфічная сістэма моўных сродкаў, якая ўжываецца ў пэўнай сферы грамадскай дзейнасці.

У аснову вылучэння стыляў клаліся сацыяльны, жанравы, эмацыянальна-экспрэсіўны прынцыпы, аднак найбольш пашыраным і навукова абгрунтаваным з’яўляецца функцыянальны прынцып. Згодна з ім стыль – гэта функцыянальная разнавіднасць мовы, форма яе грамадскага выкарыстання. Даследчык стылістыкі В.У.Вінаградаў прапанаваў абагульненую сістэму функцыянальных стыляў, якая адпавядае асноўным функцыям мовы: афіцыйны і навуковы (функцыя паведамлення), публіцыстычны і мастацкі (функцыя ўздзеяння), гутарковы (функцыя зносін).

У стылістычных даследаваннях размяжоўваюцца паняцці мова і маўленне і адпаведна – стыль мовы і стыль маўлення. Да стыляў мовы адносяць кніжныя стылі (афіцыйны, навуковы, публіцыстычны, мастацкі, канфесійны) і гутарковы (размоўны), а да стыляў маўлення – стыль рэкламы, стыль юрыдычнага дакумента, сяброўскага ліста і інш. Стыль мовы мае свае падстылі і жанры – канкрэтныя стылёва-маўленчыя разнавіднасці. Па сутнасці, кожны функцыянальны стыль уяўляе незамкнёную сістэму моўных сродкаў, здольную ўключаць элементы іншых стыляў. Найбольш кансерватыўным у гэтых адносінах лічыцца афіцыйны стыль.

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ